6. Беларускі фальклор: Энцыкл.: У 2 т. Т. 1 / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2005. – С. 491.
7. Тростина, М.А. Жестокий романс: жанровые признаки, сюжеты и образы / М.А. Тростина. – Саранск: Морд. гос. ун-т, 2003. – Вып. 4. – С. 197–202.
8. Кошелев, В.А. Пространство контекста: к истории русского городского романса / В.А. Кошелев // Вестн. Новгород. гос. ун-та. Сер. «Гуманитар. науки». – 1995. – № 2. – С. 67–71.
9. Гинсбург, С.С. Кинематография дореволюционной России / С.С. Гинсбург. – М., 1963.
10. Астахова, А.М. Московские фольклорные экпедиции 1934-1935 гг. / А.М. Астахова // Советский фольклор. – 1936. – № 4–5.
11. Адоньева, С. Современная баллада и жестокий романс / С. Адоньева, Н. Герасимова. – СПб.: Лимбах, 1996.

SUMMARY
"Origin ""Cruel romansa" in Belarus" Essence of the genre "Cruel romansa " and its origin is considered in article in Belarus.

## БЕЛАРУСКІ МУЗЫЧНЫ ФАЛЬКЛОР ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ МУЗЫЧНА-ЭСТЭТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СТАРШЫХ ДАШКОЛЬНІКАЎ

***В.М. Анцыпіровіч,***
старшы выкладчык кафедры
методык дашкольнай адукацыі
БДПУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Увага да пытанняў фарміравання музычна-эстэтычнай культуры асобы на першых этапах авалодвання ёю культурай грамадства, неад'емнай часткай якой з'яўляецца музычная фальклорная спадчына, абумоўлена актуальнасцю пытанняў, якія датычацца фарміравання розных аспектаў культуры асобы і далучэння чалавека да нацыянальнай культуры. З мэтай большай аргументаванасці неабходнасці вырашэння заяўленных пытанняў ужо з выхаванцамі дашкольнага ўзросту, неабходна, па-першае, звярнуць увагу на некаторыя асаблівасці засваення чалавекам музычнай мовы і значнасць ролі дзіцячага ўзросту ў фарміраванні асноў асабістай культуры чалавека.

Разгляданне музычнай мовы як семіятычнай (знакавай) сістэмы [1] ставіць яе у адну плоскасць з іншымі знакавымі сістэмамі (напрыклад, з вербальнай), што дапускае і сходныя механізмы іх засваення. Па сцвярджэнні К. Ул. Тарасавай, музычная мова, як і маўленне, засвойваецца ў дзяцінстве дастаткова рана і інтуітыўна, адразу як сістэма ў адзінстве семантыкі, лексікі і граматыкі [2]. Пры ўспрыманні асобай дастатковай колькасці аднастылёвых музычных узораў фарміруецца «пачуццё стылю», наяўнасць якога Дз. К. Кірнарская прапануе лічыць паказчыкам развітай музыкальнасці чалавека [3].

Фальклор з'яўляецца "азбукай" нацыянальнай музычнай мовы, універсальным матэрыялам, які адказвае патрабаванням мастацкасці і даступнасці. Фальклорны рэпертуар ляжаў у аснове найвядомейшых сістэм музычнага выхавання, распрацаваных Карлам Орфам і Золтанам Кодаям. З апорай на беларускі песенны фальклор прапанаваў ажыццяўляць музычнае выхаванне дашкольнікаў і малодшых школьнікаў айчынны педагог А.Грыневіч, аб чым сведчыць матэрыял яго «спеўнікаў», выдадзеных у 20-ыя гады XX стагоддзя. Цікаўнасцю да пошуку шляхоў выкарыстання фальклорнага матэрыялу адрозніваюцца працы сучасных расійскіх даследчыкаў. Значная ўвага надаецца фальклорнаму рэпертуару ў праграме выхавання і адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту «Пралеска». Айчынная фальклярыстыка прапануе багаты літаратурны і натаваны музычны матэрыял, фоназапісы, тэарэтыка-гістарычны і музыказнаўчы аналіз з'яў нацыянальнага музычнага фальклору. Аднак у айчыннай педагагічнай навуцы не існуе спецыяльных даследаванняў, прысвечаных праблеме выкарыстання нацыянальнага музычнага фальклору ў працы з дашкольнікамі.

Адна з асноўных задач музычнага выхавання ў дашкольным узросце - фарміраванне асноў музычнай культуры асобы [4]. Музычная культура асобы, якая з'яўляецца інтаграванай пазіцыю, трактуецца даследчыкамі як мера засваення ёю музычнай культуры грамадства ва ўсёй разнастайнасці [5]. Музычна-эстэтычная культура ў дадзеным выпадку з'яўляецца сінонімам музычнай культуры асобы, аднак гэтае паняцце ў большай ступені падкрэслівае спецыфічнасць задач масавага музычнага выхавання, у якім музычнае мастацтва выступае ў першую чаргу сродкам эстэтычнага выхавання, фарміравання эстэтычных уяўленняў асобы.

Вырашэнне задачы фарміравання асноў музычна-эстэтычнай культуры асобы дашкольніка рэалізуецца праз фарміраванне асобных яе кампанентаў:

- эмацыянальнага (які складаецца з эмацыянальнай спагадлівасці і інтарэсу да музычных твораў і музычнай дзейнасці);
- слыхавага (у сукупнасці музычна-рытмічнага пачуцця і меладычнага слыху);
- кагнітыўнага (у аснове якога ляжыць рэпрадуктыўнае і прадуктыўнае музычнае мысленне);
- інфармацыйнага (які ўключае веды аб музычных з'явах і некаторыя пазамузыкальныя уяўленні пра агульны кантэкст існавання твораў);
- ацэначнага (музычныя перавагі).

Развіццё дадзеных кампанентаў адбываецца ў адпаведнай дзейнасці, такіх яе відах, даступных для дзяцей гэтага ўзросту, як успрыманне музыкі, спевы, музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне, музычная творчасць.

Адной з яскравых праяў музыкальнасці дашкольніка з'яўляецца эмацыянальная спагадлівасць на музыку. Яна можа разглядацца не толькі як непасрэдная рэакцыя на настрой, характар гучання музыкі, што звязана з тыпам нервовай сістэмы, але і як праяўленне эмацыянальна-маральнай спагадлівасці. Фальклор ў гэтым сэнсе не з'яўляецца выключэннем з агульных правілаў, якім падпарадкоўваецца музычнае мастацтва. Акрамя гэтага, у шматлікіх фальклорных творах, якія захавалі найбольш архаічныя рысы музычнага мастацтва (вядомы даследчык беларускага фальклору У. Ялатаў называе гэты гістарычны этап развіцця эмацыянальнай музыкі «этапам эмацыянальнай тыпізацыі» [6]), прысутнічаюць разнастайныя інтанацыі-эмоцыі, якія застаюцца актуальнымі і для сучаснага чалавека. Гэта словы, заклікі, выклічнікі, уздыхі, імітацыі, якія страцілі семантыку і прысутнічаюць у веснавых і калядных песнях, калыханках і забаўлянках, пастуховых песнях, галашэннях і інш [7]. Выкарыстанне твораў з такімі элементамі ў працы з дашкольнікамі можа садзейнічаць больш глыбокаму разуменню эмацыянальнага зместу музыкі, усведамленню імі генетычнай сувязі паміж моўнай і музычнай інтанацыямі.

Музычны фальклор паспяхова садзейнічае фарміраванню інтарэсу дзяцей да музычнай дзейнасці. Злітнасць у адным творы шматлікіх элементаў (песні, танца, ігры на інструменце, гульні) дазваляе кожнаму дзіцяці праявіць сябе ў найбольш цікавых для яго відах музычнай дзейнасці і, адначасова, вымушае яго ўдзельнічаць у іншых відах. Існуючая цесная сувязь фальклору са з'явамі жыцця робіць музычны матэрыял больш прывабным для дашкольніка, дазваляе выходзіць за рамкі выключна музычнай дзейнасці.

Асноўнымі музычнымі здольнасцямі традыцыйна лічацца музычна-рытмічнае пачуццё (або пачуццё рытму) і меладычны слых (у адзінстве ладавага пачуцця і музычна-слыхавых уяўленняў) [8].

Музычна-рытмічнае пачуццё выражаецца ў здольнасці эмацыянальна адчуваць выразнасць музычнага рытму і дакладна ўзнаўляць яго (гэта значыць эмацыянальна адлюстроўваць рытмічны малюнак, метрычную аснову музыкі, тэмп і яго змяненні). Найбольшую складанасць у дашкольнікаў выклікае дакладнае адлюстраванне рытмічнага малюнка. Менавіта гэты напрамак у развіцці музычна-рытмічнага пачуцця патрабуе найбольшай увагі з боку педагога і павінен рэалізоўвацца шляхам засваення дзецьмі сістэмы рытмічных эталонаў. Сярод узораў танцавальна-гульнёвага фальклору шмат такіх, дзе прысутнічаюць даступныя дашкольнікам імітацыйныя, вобразныя, традыцыйныя танцавальныя рухі. Праз далучэнне дашкольнікаў да выразнага і дакладнага выканання музычна-рытмічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рухаў на фальклорным матэрыяле маецца магчымасць развіцця і музычна-рытмічнага пачуцця, і навыкаў музычна-рытмічнай дзейнасці.

Ладавае пачуццё – гэта здольнасць распазнавання ладавых функцый гукаў мелодыі, калі ўсе яе гукі ўспрымаюцца ў іх адносінах да тонікі і іншых ступенях ладу [8]. Менавіта развітае ладавае пачуццё дазваляе адчуваць эмацыянальную выразнасць мелодыі. Для дзяцей дашкольнага ўзросту (і нават малодшых школьнікаў) асноўную інфармацыю аб характары музыкі нясе не столькі яе ладавая арганізацыя, колькі дынаміка, рэгістр, тэмп. Але, па дадзеных К.Ул. Тарасавай, меладычная арыентацыя пры ўспрыманні музыкі, распазнаванне мелодыі ў незалежнасці ад змены тэмпа, рэгістра, дынамікі, з'яўляецца ўжо ў пяцігадовым узросце [2]. Садзейнічаць станаўленню такой меладычнай арыентацыі можа сістэматычная работа па назапашванню дашкольнікамі слоўніка мелодый-інтанацый у працэссе ўспрымання музыкі і спеваў. Традыцыйна шырока выкарыстоўваюцца ў музычным выхаванні дашкольнікаў творы, якія маюць у сваей аснове мажор і мінор – актаўныя лады, шырокараспаўсюджаныя ў еўрапейскай музыцы пісьмовай традыцыі. Гэта значна збядняе слыхавы вопыт дзіцяці і накіроўвае развіццё ладавага пачуцця менавіта па гэтым шляху. Вузкааб'ёмныя лады (тэрцыявыя, квінтовыя і інш.) народнай музыкі больш даступныя для дзіцячага ўспрымання, іх засваенне павінна быць неабходным этапам у музычным развіцці дзіцяці. У свой час З. Кодай адзначаў, што для дзіцячага сада асабліва падыходзяць пентатанічныя мелодыі як больш даступныя і характэрныя для нацыянальнай музыкі (у дадзеным выпадку венгерскай) [9].

Калі ладавае пачуццё – перцэптыўны (адказны за ўспрыманне) кампанент меладычнага слыху, то музычна-слыхавыя ўяўленні – рэпрадуктыўны (адказны за ўзнаўленне) кампанент меладычнага слыху і непасрэдна звязаны з інтанаваннем дзецьмі гукаў мелодыі голасам або выкананнем іх на музычным інструменце.. Паводле меркавання Э Аляксеева, менавіта ва ўзорах фальклору зафіксаваны і захаваны этапы станаўлення музычнага мыслення чалавека, адлюстраваны ў тыповых напевах і характэрныя для розных перыядаў гэтага станаўлення тыпы інтанавання мелодыі [10]. Такім чынам, шлях дзіцяці да чыстага інтанавання непазбежна ідзе праз засваенне першасных тыпаў інтанавання, якія ў сваю чаргу зафіксаваны ў фальклорных узорах розных жанраў. Гэтыя ўзоры прапануюць інтанацыйныя і ладавыя эталоны, паслядоўнае засваенне якіх з'яўляецца неабходным крокам у індывідуальным музычным развіцці.

Нельга не спыніцца і на такой асаблівасці песеннага фальклору, як пераважнае выкананне гэтых твораў без акампанемента (a capella). Улік гэтай асаблівасці і выкарыстанне ў працы з дашкольнікамі менавіта такіх спеваў дазваляе больш плённа працаваць над фарміраваннем чысціні інтанавання, што азначае і дадатковыя магчымасці ў развіцці меладычнага слыху дзіцяці.

Вельмі шырокія магчымасці мае фальклор у развіцці прадуктыўнага музычнага мыслення, якое праяўляецца ў дашкольнікаў праз стварэнне ўласных невялічкіх «сачыненняў», якія, часцей за ўсё, носяць імправізаваны характар – адначасова «мысляцца» і выконваюцца. Тыповасць рытмікі, ладавай будовы розных узораў фальклору ў межах пэўнага жанру (напрыклад, калыханак) значна палягчаюць стварэнне свайёй імправізацыі ў гэтым жанры, якая ў дадзеным выпадку ствараецца па пэўнай «формуле». Гэта робіць музычную творчасць даступным відам дзейнасці амаль для кожнага дзіцяці.

Спецыфічныя магчымасці фальклору ў атрыманні ведаў аб музычным мастацтве датычацца ўдакладнення і пашырэння ўяўленняў дашкольнікаў аб музычных жанрах, тых з іх, якія прысутнічаюць у музыцы пісьмовай традыцыі (разнастайныя песенныя і танцавальныя жанры), знаёмства з музычнымі фальклорнымі жанрамі (заклічка, забаўлянка, жанры каляндарна-абрадавага фальклору і інш.). Знаёмства з гучаннем традыцыйных беларускіх музычных інструментаў (скрыпкі, цымбал, дуды, гармоніка, балалайкі і інш.), іх назвамі і асаблівасцямі канструкцыі дазваляе пашырыць уяўленні дзяцей аб музычных інструментах увогуле, актывізаваць музычнае ўспрыманне і разумовую актыўнасць дзяцей (напрыклад, пры параўнанні гучання аднаго твора у выкананні розных фальклорных інструментаў і інструментаў сімфанічнага аркестра). Разам з атрыманнем і пашырэннем ведаў аб музычным мастацтве дашкольнік атрымае веды і пра канкрэтныя музычныя творы фальклору, што зробіць гэтыя творы распазнаваемымі для яго, дазволіць стварыць у свядомасці дашкольніка своеасаблівы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«каталог» агульнавядомых нацыянальных музычных сімвалаў. Акрамя таго, у працэсе азнаямлення з музычным фальклорам дашкольнік непазбежна атрымлівае разнастайныя пазамузыкальныя веды, якія датычацца кантэкстаў выканання пэўных твораў, знаёміцца з некаторымі традыцыямі і звычаямі, асаблівасцямі побыту і інш.

Складана весці размову аб ролі фальклорнага рэпертуару ў фарміраванні музычных пераваг дашкольнікаў. Цяжка ўявіць сабе дашкольніка, які будзе аддаваць фальклору перавагу перад, напрыклад, сучаснай музыкай, вакальнымі творамі для дзяцей і інш. Але, безумоўна, уключанасць у музычную дзейнасць фальклорных твораў зафіксуе ў падсвядомасці дзіцяці каштоўнасць фальклору, дазволіць вызначыць яго месца і ролю ў музычнай культуры грамадства. Усё гэта ў больш сталым узросце, калі нават і не вырасце ў асаблівую зацікаўленасць гэтым відам мастацтва, то дазволіць з павагай адносіцца да фальклорнай культуры, разумець і прымаць яе.

Такім чынам, нацыянальны музычны фальклор, неабходнасць пашырэння сферы выкарыстання якога ў выхаванні дашкольнікаў абумоўлена сучасным сацыякультурным становішчам, мае разнастайныя магчымасці ў музычным развіцці дашкольніка, фарміраванні кампанентаў яго музычна-эстэтычнай культуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Арановский, М.Г. Мышление, язык, семантика / М.Г. Арановский // Проблемы музыкального мышления. – М.: Музыка, 1974.
2. Тарасова, К.В. Онтогенез музыкальных способностей / К.В. Тарасова. – М., 1988.
3. Кирнарская, Д.К. Современные представления о музыкальных способностях / Д.К. Кирнарская // Вопросы психологии. – 1988. – № 2. – С. 129–137.
4. Радынова, О.П. Музыкальное воспитание дошкольников : учеб. пособие для студ. вузов / О.П. Радынова, А.И. Катинене, М.Л. Палавандишвили. – М., 1997.
5. Каган, М.С. Философия культуры / М.С. Каган. – СПб., 1996.
6. Елатов, В.И. Ладовые основы белорусской народной музыки / В.И. Елатов. – Минск, 1964.
7. Елатов, В.И. Мелодические основы белорусской народной музыки / В.И. Елатов. – Минск, 1970.
8. Теплов, Б.М. Психология музыкальных способностей : избр. тр.: В 2 т. – Т. 1 / Б.М. Теплов; ред.-сост. Н.С. Лейтес, И.В. Равич-Щербо. – М., 1985.
9. Кодай, З. Музыка в детском саду : избр. ст. / З. Кодай. – М., 1982. – С. 145–192.
10. Алексеев, Э.Е. Раннефольклорное интонирование / Э.Е. Алексеев. – М., 1986.

SUMMARY

In the context of the concept of musical and aesthetic education of the preschool child presents problem of folk-musical education.

## СОВРЕМЕННЫЕ МЕТОДЫ КОРРЕКЦИИ ПЕВЧЕСКОГО ГОЛОСА

***Г.Б. Ромейко, Н.М. Фигурова,***
старшие преподаватели кафедры
музыки и хореографии БГПУ,
г. Минск, Республика Беларусь

В основе постановки голоса лежит правильная вокально-техническая культура исполнения. Поэтому именно работа над певческими навыками есть стержень, вокруг которого разворачиваются все остальные элементы учебно-воспитательного процесса. Исполнительский уровень, перспективы творческого роста, жизнеспособность голоса, его стабильность – все это зависит прежде всего от качества учебно-воспитательных занятий, которые являются составной частью и непременным условием профессионального обучения.

Репозиторий БГПУ